# Сродкі навучання дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення

**С. П. Хабарава**
**кандыдат пед. навук, дацэнт**

**Сродкі навучання**– гэта матэрыяльная ці ідэальныя аб'екты, якія выкарыстоўваюцца настаўнікам і навучэнцамі, з'яўляюцца крыніцай навучальнай інфармацыі і прыладамі для асваення зместу навучальнага матэрыялу навучэнцамі, іх выхавання і развіцця.

# Функцыі сродкаў навучання

- ***пазнавальная:*** сродкі навучання спрыяюць фармаванню больш поўных і дакладных уяўленняў пра наяўную рэчаіснасць, дазваляюць палегчыць вучню працэс асэнсавання і запамінаннія фактаў і заканамернасцяў, робяць наглядны́мі і зразумелымі з'явы і аб'екты, якія недаступныя для назірання ў рэальным жыцці;
- ***фарміруючая:*** з дапамогай сродкаў навучання развіваецца пазнавальная актыўнасць навучэнцаў;
- ***дыдактычная:*** сродкі навучання з'яўляюцца крыніцамі ведаў і ўменняў, спрыяюць засваенню навучальнага матэрыялу.

# Сродкі навучання ўзаемазвязаны з усімі кампанентамі дыдактычнай сістэмы



# Класіфікацыя сродкаў навучання

- Па складзе аб'ектаў

**Матэрыяльныя**

навучальныя выданні, табліцы, мадэлі, макеты, навучальна-лабараторнае абсталяванне, па мяшканні, мэбля, абсталяванне навучальнага кабінета, мікра-клімат, расклад заняткаў,іншыя матэрыяльна-тэхнічныя ўмовы навучання.

**Ідэальныя**

пісьмо, схемы, умоўныя пазначэнні, чарцяжы, дыяграмы, творы мастацтва.

❖ Па пастаўленай дыдактычнай задачы і спосабе яе рэалізацыі

## Наглядныя сродкі

- Натуральныя, наглядныя
- Ілюстрацыйна-выяўленчыя (вобразныя, сімвалічныя, схематычныя, графічныя)

## Вербальна-інфармацыйныя сродкі

- Падручнікі, навучальныя дапаможнікі для дзяцей, навучальна-метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў, слоўнікі і інш.

## Тэхнічныя сродкі

- Камп'ютары, відэатэхніка, аўдыётэхніка

❖Па характары ўяўлення навакольнай рэчаіснасці

| Натуральныя прадметы і аб'екты | Выявы і адлюстраванні матэрыяльных аб'ектаў | Апісанне прадметаў і з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці ўмоўнымі знакамі | Тэхнічныя сродкі навучання (ТСН) |
|---|---|---|---|
| Прадметы аб'ектыўнай рэчаіснасці для непасрэднага вывучэння | Мадэлі, макеты, табліцы, ілюстраваныя матэрыялы, экранна-гукавыя сродкі і інш. | Знакі, схемы, формулы, арыфметычныя запісы і інш. | Камп'ютар, праектар, дыяпраектар, дыяскоп і інш. |

# Сродкі навучання

- забяспечваюць наглядна-практычную аснову вывучэння матэрыялу;
- робяць навучанне максімальна даступным для навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення, дазваляюць улічваць іх пазнавальныя магчымасці на розных узроставых этапах;
- спрыяюць маўленчаму развіццю дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення (вербальна-інфармацыйныя сродкі, схемы маўленчых выказаў, запісу на дошцы і т. п.);
- забяспечваюць патрэбны узровень свядомасці і трываласці засваення навучальнага матэрыялу;
- спрыяюць засваенню ведаў у пэўнай сістэме;

# Сродкі навучання

- ✓ забяспечваюць карэкцыйна-кампенсавальную скіраванасць навучання навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення;
- ✓ спрыяюць фарміраванню ведаў, уменняў і навыкаў, патрэбных для сацыяльнай адаптацыі;
- ✓ надаюць магчымасць для ўліку індывідуальных асаблівасцяў, вучацца рэалізацыі дыферэнцыяванага падыходу да навучання;
- ✓ спрыяюць фармаванню навыкаў сістэматычнай працы па самастойным набыцці ведаў;
- ✓ спрыяюць не толькі засваенню ведаў і фарміраванню спосабаў дзеянняў, але і развіццю асобы.

# Асаблівасці выкарыстання сродкаў навучання дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення

- імкненне да магчыма большай натуральнасці прапанаваных для азнаямлення і даследавання аб'ектаў і прадметаў;
- наглядна-практычны характар знаёмства і даследавання выстаўленых прадметаў, аб'ектаў: дзіцё па магчымасці павінна атрымаць максімальна поўную інфармацыю аб аб'екце, з выкарыстаннем усіх аналізатараў;
- пачуццёва-наглядныя вобразы, прыкметы прадметаў, з'яў, якія ўспрымае дзіцё, абавязкова павінны быць замацаваны ў слове.

# Сродкі навучання дзяцей
# з цяжкімі парушэннямі маўлення

**С. П. Хабарава**
**кандыдат пед. навук,**
**дацэнт**